БАЦЬКАЎШЧЫНА

WHITERUTHENIAN WEEKLY „THE FATHERLAND" Цана 30 н. фэн.

№ 34 (37) 31 КАСТРЫЧНІКА 1948 Г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 2

БЕСПАДСТАЎНЫЯ ЗАКІДЫ

ЗАЯВА СТАЛІНА Й РЭАКЦЫЯ ЗАХАДУ

Пасьля таго, калі спробы Рады Бясьпечнасьці разьвязаць справу Бэрлінскага канфлікту дзякуючы вэто савецкай дэлэгацыі кончыліся няўдачай і калі, паміма гэтага, прадстаўнікі трох заходніх гаспадарстваў выказалі згоду шукаць далейшых магчымасьцяў паразуменьня з Савецкім Саюзам, Сталін 28 кастрычніка ў інтэрв'ю з карэспандэнтам «Праўды» моцна заатакаваў заходнія гаспадарствы, якія, быццам, стараюцца выклікаць новую сусьветную вайну.

Гэтак на запытаньне карэспандэнта, як заглядаецца Сталін на апошнюю спробу Рады Бясьпечнасьці развязаць Бэрлінскае пытаньне і пазыцыю ў гэтай справе прадстаўнікоў англа-амэрыканскіх урадаў, апошні адказаў, што гэта былі «довады агрэсыўнай палітыкі пануючых клясаў ЗША, Вялікабрытаніі й Францыі». У далейшым ён заявіў, што гэтыя гаспадарствы сьвядома й адкрыта імкнуцца выклікаць новую сусьветную вайну.

На запытаньне карэспандэнта, чым гэта ўсё кончыцца, Сталін адказаў даслоўна: «Гэта можа ўсё скончыцца толькі няслаўным правалам усіх падбухторшчыкаў да вайны. Галоўны падбухторшчык да новае вайны Чэрчыль якраз ужо дасягнуў таго, што згубіў давер свайго народу і ўсіх дэмакратычных сілаў захаду. Такі-ж самы лёс чакае і ўсіх іншых падбухторшчыкаў да вайны».

У справе пазыцыі шасьці нэўтральных гаспадарстваў — сяброў Рады Бясьпечнасьці: Аргентыны, Кітаю, Бэльгіі, Канады, Калюмбіі й Сырыі, Сталін сказаў, што ўсе яны «падтрымліваюць агрэсыўную палітыку, якая вядзе да вайны».

Гэтыя заявы Сталіна выклікалі ў заходнім сьвеце вялікую рэакцыю. У колах цяперашняй сэсыі ЗН выказваецца пагляд, што па колькі Молатаў, Вышынскі й іншыя савецкія дыпляматы ўжывалі ўжо часта даволі вострых словаў, у дачыненьні да захаду, то Сталін захоўваўся ўвесь час устрымана й тактычна. Яшчэ ні разу перад гэтым Сталін афіцыяльна не выступаў з такімі вострымі словамі. Дыпляматычныя колы захаду непакояцца з гэтае прычыны, што надзеі на развязаньне Бэрлінскага пытаньня моцна пахіснуліся.

Прэсавыя камэнтары заходняга сьвету аб выказваньнях Сталіна зьяўляюцца аднадумныя. Шэраг французскіх газэт сьцьвярджае, што гэтыя заявы Сталіна зьяўляюцца амаль што роўназначнымі з абвешчаньнем вайны. Газэта «Ляўрор», прыкладам, заяўляе, што Сталін практычна ўжо абвесьціў вайну дэмакратыям.

САВЭЦКАЕ ВЭТО Ў СПРАВЕ БЭРЛІНА

У мазапрошлую пятніцу адбылося наступнае пасьджаньне Рады Бясьпечнасьці ў справе Бэрліна. Праект рэзалюцыі, прыгатаваны нэўтральнымі гаспадарствамі — сябрамі Рады, патрабаваў: 1. Безадкладнага зьнясеньня ўсіх траспартных агранічэньняў паміж Бэрлінам і заходнімі зонамі Нямеччыны, заведзенымі пасьля 31 сакавіка сёлета. 2. Безадкладнае канфэрэнцыі акупацыйных губэрнатараў чатырох гаспадарстваў у справе ўвядзеньня ўва ўсіх зонах Бэрліна ўсходняй нямецкай маркі пад кантроляй усіх чатырох гаспадарстваў. Праект рэзалюцыі патрабаваў, каб абодвы гэтыя мерапрыемствы былі праведзеныя ў жыцьцё да 20 лістапада. У далейшым чатыры гаспадарствы былі закліканыя не выклікаць ніякіх непаразуменьняў, што маглі-б прывесьці да пагоршаньня ўзаемадачыненьняў між імі. Гэты праект не зьмягчаў ніякага асуджэньня Савецкага Саюзу, навет слова «блякада» ня было ўспомненае.

У панядзелак 25 кастрычніка гэты праект быў паставлены на парадку дня Рады Вясьпечнасьці. Пасьля таго, калі дэлегацыі заходніх гаспадарстваў высказаліся, што яны будуць за яго галасаваць, прадстаўнік Савецкага Саюзу Вышынскі заявіў у гэтай справе сваё вэто.

АФІЦЫЯЛЬНА ЗАПРАЕКТАВАНЫ АТЛЯНТЫЧНЫ ПАКТ

Міністры замежных справаў заходняй вуніі 26 кастрычніка нараджаліся аб наступных справах: 1. мілітарнае абароны, 2. Атлянтычным пакце, 3. нарадах пяці міністраў фінансаў, 4. француска-бэльгійскай прапанове аб эўрапэйскім парляманце.

У дачыненьні да першага пункту маюць міністры замежных справаў апрацаваць аснаўныя пункты палітыкі абароны ў рамах Брусэльскага пакту й хартыі ЗН. Асновай для дэбатаў над Атлянтычным пактам будуць дасягненьні з размоваў дыпляматычных прадстаўнікоў заходняй Эўропы з амэрыканскім міністрам замежных справаў. Пяць заходніх гаспадарстваў пастанавілі імкнуцца, каб быў зарганізаваны гэты пакт з удзелам ЗША й Канады. Як падаецца з Парыжа, нарады міністраў замежных справаў мелі часовы характар. Да гэтага часу ня былі афіцыяльна названыя ані эўрапэйскія, ані амэрыканскія гаспадарствы, што ў гэтым пакце мелі-б прыймаць удзел, а таксама ня быў вызначаны характар гэтага пакту.

У канадыйскіх урадавых колах уважаюцца пастановы пяці міністраў замежных справаў за вялікі посьпех канадзкай дыпляматыі. Гэтыя дасягненьні ёсьць вынікам парамесячнай працы міністра замежных справаў Канады Пэрзона.

У Вашынгтоне было абвешчана, што пасьля выбараў новага прэзыдэнта будуць прадпрынятыя новыя меры ў справе Атлянтычнага пакту. Ёсьць прыпушчэньні, што й лацінская Амэрыка далучыцца да гэтага пакту.

Маскоўскае радыё зарэагавала вельмі востра на факт канфэрэнцыі міністраў замежных справаў заходняй вуніі. Масква між іншага падае: «Падчас таго, як нашыя прадстаўнікі ў ЗН стараюцца правесьці плян разбраеньняў, то падпальшчыкі вайны па загаду амэрыканскіх імпэрыялістых куюць новы мілітарны блёк».

Чытайце, пашырайце й выпісвайце адзіную беларускую газэту на эміграцыі — «БАЦЬКАЎШЧЫНУ!».

УМОВЫ МІРУ МАРКОСА

Парыж. «Гэнэрал» Маркос падаў да ведама умовы, паводля якіх ён гатовы застанавіць ваенныя дзеяньні: ён жадае стварэньня кааліцыйнага ўраду ў Грэцыі, адкліканьня ўсіх ваенных місыяў і правядзеньня выбараў пад даглядам камісіі Задзіночаных Нацыяў. Апрача таго, легалізацыі прафэсыянальных саюзаў і звальненьня ўсіх палітычных вязьняў. Палітычны савет ЗН дыскутуе далей над справаздачай свае Балканскае Камісіі.

ЦЯЖКІЯ БАІ Ў МАНДЖУРЫІ

Нанкін. У Манджурыі дайшло да цяжкіх баёў між камуністычнымі й урадавымі войскамі, якія імкнуцца прабіцца праз акружэньне ў кірунку на Пэкін .

Камуністыя ўвайшлі ў паўночнае прадмесьце гораду. Яны, быццам, акружылі 12 дывіз. урадавага войска.

Сталінская дружба народаў

ГОД ПРАЦЫ

Дня 31 кастрычніка 1947 г. выйшаў у Рэгенсбурзе першы нумар «Бацькаўшчыны». Блізу гадавыя стараньні і валакіта, якія папярэдзілі былі яго выхад, закончыліся шчаслівым вынікам. І якім той першы экзэмпляр ня быў, якімі ня былі яго хібы і заганы — памятаем усе добра, зь якой радасьцяй і разам з надзеяй у сэрцы падавалі мы з рук у рукі першую беларускую газэту на чужыне. І вось мінуў ужо цэлы год, доўгі год нялёгкага жыцьця на ласцы і няласцы, год цяжкіх дазняньняў і бясконцых тарапатаў. — Сьветлых хвілінаў было запраўды мала, затое далося асіліць колькі мамэнтаў безнадзейна цяжкіх і складаных, перад якімі, здавалася, праваляць усе пляны і надзеі на будучыню. «Бацькаўшчына» хісталася і прытухала, але усё-ж ня згасла... Пранясьліся віхры ліхія і сяньня, сьцьвярджаем з упэўненасьцю: «Бацькаўшчына» акрэпла парадкам і мацуецца з кажным днём усё больш. Ня лішне тады будзе гэтым месцам выразіць ад імя Беларускага Нацыянальнага Камітэту і Рэдакцыі «Бацькаўшчыны» сардэчную падзяку ўсім тым беларускім арганізацыям і паасобным патрыётам, што не забыліся ў крытычную хвіліну пасьпяшыць з маральнай ці матарыяльнай падтрымкай нашых высілкаў. Належыць таксама шчырае прызнаньне і тым шырокім кругом нашых чытачоў, якія разумеюць дастаткова нятолькі неабходнасьць і карыснасьць свае роднае газэты ў чужым краі, але таксама, што газэта ня можа толькі з паветра жыць... А для паўнакроўнага жыцця газэты патрэбныя нятолькі сродкі матарыяльныя, але, і зусім ня ў меншай меры, жывы і сталы кантакт з чытачом — неабходна між імі пэўная адпаведнасьць, узгадненьне і вымена думак. Бяз гэтага газэта траціць грунт пад нагамі і сам сэнс свайго існаваньня.

Аглядаючыся на мінулы, адыйшоўшы у архіў гісторыі, год працы, мімавольна пытаем сябе: Ці апраўдала «Бацькаўшчына» ідэю, што пакладзена у яе назоў? Ці выканала яна за гэты год тую вялікую місію, што прыпала на яе долю сярод ідэйна-палітычнай беларускай эміграцыі ў сьвеце? Не зачыняючы вачэй на адносна скромныя маштабы нашых магчымасьцяў і рэлятыўных асягненьняў, а кіруючыся голасам нашых чытачоў з усіх частак сьвету і з усіх краін, дзе б'ецца хоць адно шчыра-беларускае сэрца — усюды «Бацькаўшчына» панесла сьвежы кліч адраджэньня беларускае нацыі і нашага гаспадарства, усюды прынесла яна з сабою дарагое беларусу водгульле тае далёкае цяпер, а найдаражэйшае яму, старонкі беларускае, нашае прыгожае, расьпятае не за свае грахі Бацькаўшчыны-Беларусі. Работнік з-за акіяну, ці былы жаўнер з Лёндану, цяжка хворы сухотнік, ці дажывотна засуджаны вязень — усе яны з удзячнасьцю пішуць, што «Бацькаўшчына» падтрымала іх у адзіноце і стала запраўдным прыяцелем, а часта адзіным пасланцом ад родных ніў і брата-беларуса. Асьмяляемся тады цьвердзіць, што заданьне сваё газэта выканала поўнасьцю задавальняюча. Не азначае гэта, што мы несвядомыя сваіх нястачаў і заганаў. Наадварот, асягненьне вышэйшае кваліатыўнае ступені, у сэнсе нацыянальна-ідэёвым і журналістычным, нашае працы ставім сабе як пільнае заданьне на найбліжэйшую будучыню. У сувязі з гэтым плянуецца і грунтоўная перабудова вонкавае формы газэты. На усё гэта, як ужо сказана, патрэбныя дзьве рэчы: матарыяльная база і нематарыяльная база, або людзкія сэрцы і мазгі... Цяжкія крызы мінулага году у вабодвух дачыненьнях аставілі па сабе вельмі характэрныя і навучальныя дазнаньні, а навет і некаторыя неспадзяванкі. Дазнаньні гэныя не астануцца, бязумоўна, бяз уплыву на форму і зьмест нашае газэты. Вось якраз на іх аснове мы можам цьвердзіць зь верай і ўпэўненасьцю, што які-б ліхі віхор не сустрэў нас ізноў на будучым цяжкім шляху нашае адказнае працы — заўсёды знайдуцца людзі з гарачым сэрцам, што выявяць у сабе сілу таго пачуцьця, якое кажа ставіць вялікую нашу беларускую справу вышэй за эгаізм. Зь імі і пацягнем воз далей.

КАНАДА ЗГАДЖАЕЦЦА НА АТЛЯНТЫЧНЫ ПАКТ

Міністар замежных справаў Канады Пэрзон 28 кастрычніка падаў да ведама, што канадзкі ўрад згадзіўся прыступіць да перамоваў у справе зарганізаваньня паўночна-атлянтычнага пакту.

Гаспадарствы заходняй вуніі лічацца з тым, што іхныя міністры замежных справаў у сакавіку або красавіку выедуць у Вашынгтон, каб адбыць у гэтай справе перамовы з урадам ЗША. Паводля паведамленьня аўтарытэтных колаў, заходня-эўрапэйскія гаспадарствы плянуюць у кароткім часе выставіць 50 дывізіяў арміі, каб магчы абараняць лінію Рэйну. Кошты ўзбраеньня гэтае арміі аблічаныя на дзевяць мільярдаў даляраў.

СЯБРЫ ЎРАДУ МЭКЛЕНБУРГУ АРЫШТАВАНЫЯ

Шэраг кіраўнічых асобаў ураду нямецкай правінцыі Мэкленбургу нядаўна былі савецкімі ўладамі арыштаваныя пад закідам, што яны прыгатаўляліся ўцячы ў заходнія зоны Нямеччыны.

ЭЎРОПА МАГЛА БЫЦЬ СВАБОДНАЯ

(Ніжэй паданыя факты базуюцца на разважаньнях амэрыканскага дыпляматы Уільяма Булліта, які будучы дыпляматычным прадстаўніком у Пецербургу і Парыжы і які як даверапая асоба прэзыдэнта Рузвэльта меў нагоду пазнаць закулісную палітыку сьвету).

Пажаданьні амэрыканскага прэзыдэнта Рузвэльта, каб скаптаваць Сталіна на старану дэмакрацыі, што было-б зарукай мірнага супрацоўніцтва з іншымі дэмакратычнымі народамі сьвету, заслугоўваюць на поўную апрабату. Ён у сваіх меркаваньных выходзіў з залажэньня, што мае дачыненьні з чэсным партнэрам, які джэнтэльмэнска будзе рэспэктаваць ўсе прынятыя договары ці забавязаньні. Гэтае залажэньне і было прычынай, што дазволіла яму зрабіць рад памылак, якія пазьней сталіся падставай непажаданых наступстваў.

Вельмі часта яго папярэджвана,, каб не занадта давяраў савецкаму дыктатару і што Сталін здольны да сарваньня кожнага договару. Рузвэльт аднак верыў, што ён сваёй чэснасьцю і парадачнасьцю нат найбольш грубы характар здолее маральна заставіць да такога-ж спосабу паступаньня, які ён сам практыкаваў і што гэта заставіць другую старану пайсьці на сустрэчу.

Калі дыскутавалася пытаньне памогі Саветам у форме пазыкі і арэнды, сп. Булліт і другія дарадчыкі амаль што на каленях прасілі прэзыдэнта, каб ён не згаджаўся на даваньне памогі без атрыманьня поўных гарантыяў са стараны Саветаў, менавіта, патрабаваць ад Саветаў, каб яны рэспэктвалі й не супраціўляліся у тварэньні эўрапэйскай фэдэрацыі і каб не паднімалі прэтэнсіяў адносна Кітаю.

Калі-б гэтыя парады былі ўзяты тады пад увагу, дык сьвет не стаўбы перад такой праблемай, якая зьяўляецца на сёньняшні дзень. Аднак Рузвэльт не пазволіў сябе пераканаць. Ён апіраўся на тое, што Амэрыка сільная і можа сабе пазволіць на кіраваньне лёсам сьвету, тады калі Савецкі Саюз ня быў у стане без амэрыканскай дапамогі затрымаць нямецкі наступ. Такім чынам Савецкі Саюз атрымаў, амаль фантастычную суму, 1 Мільярд даляраў, не забавязваючыся да нічога.

На падзяку з Крамлю не прышлося вельмі доўга чакаць. Як ведама Амэрыка і Англія ўступілі ў вайну ўвабароне вольнасьці і незалежнасьці эўрапэйскіх краінаў. Ня гледзячы на гэта, Сталін меў адвагу патрабаваць ад Удэна, які на пачатку сьнежня 1941 году быў у Маскве, каб Англія прызнала анэксію Эстоніі, Літвы, Латвіі, усходняй часткі Фінляндыі, частку Румыніі і ўсходняе Польшчы.

Амэрыканскі ўрад па атрыманьню гэтай весткі, паведаміў ангельскі ўрад, што ён ёсьць супраць гэтых плянаў анэксіі, але на гэтым толькі і скончылася.

Першы крок дыпляматычнага адступу, перад брутальнасьцю савецкага дыктатара быў зроблены.

З ЧАГО РАЗЬВІЎСЯ САВЕЦКІ ШПІЯНАЖ У АМЭРЫЦЫ

Чэрчыль быў перакананы, што наступ на Балканы перашкодзіць Саветам у апанаваньні даліны Дунаю. Аднак, амэрыканскія вайсковыя тэарэтыкі былі супраць гэтага пляну, да якіх далучыўся і Рузвэльт.

Ён гэтым хацеў зарэпрэзэнтаваць сваю поўную лаяльнасьць у адносінах да Сталіна і з дапамогай свайго супрацоўніка Гары Гопкінса выпрацаваў плян, які паводле яго думкі, меў стаіць апошнія лёды у сэрцы крэмляўскага валадара. Гэтым шахуючым ходам было, даць Саветам без ніякіх засьцярогаў ці гарантыяў усё тое, што яны патрабуюць да вядзеньня вайны. Далей быў ён перакананы аб патрэбнасьці атлянтычнае хартыі і трэйцяе, што дазволіла камуністам на вядзеньне свае падрыўнай працы ў Амэрыцы, гэта тое, што ён паведаміў Крэмль аб сваіх намерах перакананьня амэрыканскага народу на старану Саветаў. На канец запрапанаваў супольнае спатканьне, на якім хацеў перакананаць Сталіна, каб гэты прызнаў хрысьціянскія падставы дэмакратычных прынцыпаў .

Амэрыканская прапаганда зачынае пераконваць, што Савецкі Саюз мае добрыя пачыны, стацца міралюбным дэмакратычным народам. Вестка, што Сталін зьмяніў курс у гэтым напрамку, пранікла у кожную хату. Сталася ўжо навет нацыянальным абавязкам дэманстраваньне публічна сваіх сымпатыяў для Савецкага Саюзу. Гэтыя поўнасьцю скарысталі з такіх шансаў; стаўляюць сваіх агентаў у фабрыкі, вайсковыя прадпрыемствы, грамадзкае жыцьцё. Закладаюць «Саюз савецкіх сымпатыкаў». Рэзультатам гэтага ўсяго былі цяжкія шпіянажныя афэры, якія сягалі аж у найвышэйшыя ўрадавыя кругі, і якія цяпер месяцамі разьбіраюцца цераз спэцыяльную камісію кангрэсу.

АНЭКСІЯ ПОЛЬШЧЫ

Прэзыдэнт наймагутнейшага краю ў сьвеце, забыўшыся аб сваёй гордасьці, намагаўся безрэзультатна чатыры разы, каб спаткацца са Сталінам. За пятым разам Сталін згадзіўся на спатканьне ў Тэгэране, каб там абгутарыць праблему Ірану, які яго «непакоіў». Аднак на працягу гэтай канфэрэнцыі, якая цягнулася ад 28 лістапада да 1 сьнежня 1943 г. зусім было мала гутарак аб Іране і «занепакоеньні». Тут Сталін даказвае Чэрчылю (Рузвэльт з прычынаў хваробы не прыймаў удзелу у перагаворах), што ён канечна мусіць анэктаваць усходнюю Польшчу аж да лініі Керзона, за што Польшча павінна атрымаць кампэнсацыю ў форме усходніх нямецкіх земляў. Доказаў Чэрчыля, што гэта можа прывесьці да новай вайны, Сталін не хацеў слухаць і Чэрчыль паддаўся. Пасьля і Рузвэльт на гэта згадзіўся таксама.

Сталін ведаў, што ён ад Рузвэльта можа ўсё жадаць. Ён ведаў, што Амэрыка дасьць яму заўсёды матэрыяльную падтрымку для барацьбы супраць нацыстаўскай Нямеччыны і гэта ён зусім добра выкарыстаў, калі сказаўшы Польшчу ў кішэнь, паставіў там свае аддзелы для змаганьня з незалежніцкімі намаганьнямі.

Далёкаўсходняя трагодыя пачынаецца. Рузвэльт ўвагульнасьці задавальніўся з дасюлешніх перагавораў, едзе ўлютым 1945 г. ізноў на канфэрэнцыю ў Ялту, на якой амэрыканская палітыка панясла найбольшую ў сваёй гісторыі няўдачу.

Менавіта Рузвэльт і Чэрчыль дагаварыліся ў 1943 г. у Каіры з Чан-Кай-Шэкам, што Кітай атрымае усе тыя астравы, на Ціхакойным акіяне якія Японія здабыла ў выніку 1-ай сусьветнай вайны, а таксама і гэтыя тэрыторыі, якія калісь належалі да Кітаю як Манджурыя, Фармоза і Пэскадорэз.

Толькі таму каб магчы Сталіну прыпадабацца, гэты договар быў без веды Кітаю ў Ялце ануливаны. Рузвэльт, Чэрчыль і Сталін падпісалі тады тайны договар, паводле якога Манжурыя адступаецца Саветам. Апрача гэтага дасцца права Саветам мець свае канцэсіі у порце Дайрэн, дазвалаецца кантраляваць Порт-Артур і стратэгічна важны ім чыгунку. Таксама яшчэ ўдалося Сталіну атрымаць згоду ад Рузвэльта, што пасьля заканчэньня вайны з Японіяй, Савецкі Саюз атрымае мангольскую рэспубліку, Курыльскія астравы і паўдзённую частку Сахаліну за тое, што ён выступіць супраць Японіі, калі вайна з Нямеччынай будзе закончана. Важнасьць Курыльскіх астравоў у тым, што яны стэновяць вельмі выгодныя лётніцкія базы супраць Японіі.

Незалежнасьць Кітаю, як паказалі далейшыя падзеі, была ліквідавана, Заходнія альянты самі далі Саветам магчымасьць да зьдзейсьненьня іхніх плянаў. І так умовы для паняволеньня Азіі былі створаны.

ЛІК НАМЫЛАК ПАБОЛЬШВАЕЦЦА

Камуністыя што раз далей прасоўваюцца ў нутро Кітаю. Каб гэтаму скуточна запабегчы, быў адзіны запрапанаваны ў 1946 г. генэралам Маршалам сродак паводле якога амэрыканскія сухаземныя імарскія сілы на Пацыфіку магліб адным ударам пакончыць дамовую вайну ў Кітаі. Але ў той час амэрыканскі замежны дэпартамэнт быў думкі, што кітайскія камуністыя ня маюць ніякай лучнасьці і сувязі з Масквой. Хаця і гэта можа гучэць вельмі непраўдападобна. Аднак было сказана Чан-Кай-Шэку заключыць мір з камуністычнымі кіраўнікамі і стварыць нацыянальны ўрад з удзелам камуністаў. А сяньня Саветы ўжо асягнулі тое, што асталося толькі зашмаргнуць пятлю на шыі Кітая.

Гэта былі такія рэзультаты ялтанскай канфэрэнцыі.

Другое, таксама ня менш важнае, што Саветы былі тады прыняты ў Злучаныя Нацыі. Сталіну ізноў удалося тады прафарсаваць Беларусь і Украіну гаворачы, што гэта незалежныя дзяржавы. У результаце Саветы атрымалі 3 галасы ў Злучаных Нацыях тады калі Амэрыка толькі 1.

Хутка пасьля ялтанскай канфэрэнцыі савецкія агенты даведаліся, што у Бэрне, (Швайцарыя), заходнія альянты абгаворвалі магчымасьць сэпаратнага міру з Нямеччынай. Рузвэльт коратка перад сьмэрцю, у адказе на ліст Чэрчыля пісаў»: «Я не хачу ні ў якай меры зьмяншаць савецкай праблемы, бо яна ў такой ці іншай форме можа кажнага дня паявіцца і бэрлінскі выпадак можа выклікаць толькі споры. Мы мусім быць чуйнымі кожнай гадзіны і так далёка, як толькі магчыма, нарэктна ісьці нашай дарогай».

Такая палітыка, нажаль, не прынясла карысьці. Ані Амэрыцы ані Эўропе. Калі-б мір із Нямеччынай быў заключаны без удзелу Саветаў, зусім інакш выглядала-б гісторыя. Ня былі-б Саветы ані ў Саксоніі, ані ў Турынгіі і не дайшло-б ніколі да блякады Бэрліну.

Або каб Рузвэльт, пры даванні памогі Саветам, патрэбаваў, каб яны рэспэктавалі, дзяржаўныя межы, якія былі да 1939 году, дык Эўропа сяньня была-б свабоднай.

За прыкладам Рузвэльта ў уступаньні на карысьць Саветаў, пайшоў і яго наступнік Труман. Гэтаму, калі ён быў у 1945 г. у Потсдаме было сказана, што атамная бомба ўжо гатова. Гэтым самым памога Саветаў ў вайне супраць Японіі была зусім непатрэбна і тыя уступкі, якія былі зробленыя у Ялце на некарысьць Кітаю за кошт савецкай памогі, магчі-б анулявацца. Але Труман гэтага не зрабіў.

І так не дайшло да супакою ўва ўсходняй Азіі.

Ёсьць у людзкім жыцьці рэчы, пры успрыманьні якіх прыйходзіцца недавяршіва ківаць галавою. Да такіх якраз і належаць усе тыя, вышэй апісаныя факты.

(Паводле «ІМ Аўсляндэ», № 42, ад 23.10.48).

ВЯЛІКІ НЕСПАКОЙ У ШТУТГАРЦЕ

Падчас аднаго мітынгу ў Штутгарце, скіраванага супраць гаспадарскай палітыкі ў амэрыканскай і ангельскай зонах Нямеччыны, у якім брала ўдзел 40.000 немцаў, дайшло першы раз у заходняй Нямеччыне да паважных беспарадкаў. На адной з вуліцаў таўпа пачала біць вокны ў магазынах, у якіх былі выстаўленыя люксусовыя тавары. Нямецкай паліцыі, якую падтрымала й амэрыканская паліцыя, не ўдалося спачатку навесьці парадку. Спакой удалося ўстанавіць толькі тады, калі былі выкліканы большыя аддзелы амэрыканскай паліцыі, якія прыбылі ў танках й змушаньня былі ўжываць сьлязьлівых газаў. У выніку гэтага два амэрыканскія жаўнеры й два нямецкія паліцыянты былі раненыя. Каля пяцідзесяці дэманстрантаў было арыштованых.

ШУКАЕЦЦА ПРАЦА БЕЛАРУСКІМ ЛЕКАРАМ

Урад Аб'яднаньня Беларускіх Лекараў на Чужыне шукае ў амэрыканскай зоне Нямеччыны месца працы для некалькіх лекараў-беларусаў, а таксама для лекаркі-дэнтысткі.

Праца можа быць або шпітальная, або ў лягеры. Найбольш пажаданая ў беларускім асяродку. Паведамленьні аб магчымых месцах працы просіцца кіраваць да Ўраду АБЛЧ праз Рэдакцыю «Бацькаўшчыны».

Урад АБЛЧ.

А. Дзіда.

СУЧАСНЬЯ ПРАБЛЕМЫ

БЕЛАРУСКАЕ ВОНКАВАЕ ПАЛІТЫКІ

(Працяг)

ПАТРЭБА НОВАЕ КАНЦЭПЦЫІ БЕЛАРУСКАЕ ВОНКАВАЕ ПАЛІТЫКІ

Вызначыўшы мэты нашае вонкавае палітыкі й сьцьвердзіўшы тыя выходныя прынцыпы, якія павінны ляжаць у ейнай аснове, мы можам ужо разважаць аб нашай вонкава-палітычнай канцэпцыі. Пад ёй мы разумеем ня вонкава-палітычныя заданьні на бліжэйшы час і тым балей не блізказорнае прыстасаваньне нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў кажны раз да ўсё новай і новае міжнародна-палітычнае канюнктуры, а сваю думаю й рэальна-пэрспэктыўную праекцыю ў будучыню, якая-б змагла гарантаваць нам здабыцьцё й утрыманьне дзяржаўнае незалежнасьці ў любой міжнародна-палітычнай сытуацыі; разумеем такі далёкасяжны плян, у рамах якога пасьлядоўна вялася-б беларуская вонкавая палітыка, выконваліся-б ейныя канкрэтныя заданьні. Часам ад гэтых рамаў міжнародная палітычная каньюнктура магла-б змушаць нас рабіць тыя ці іншыя адхіленьні, але канцэпцыя, як той компас, заўсёды мела-б нам паказваць, ці вернай дарогай мы йдзем, забавязваючы ў выпадках адхіленьня ад яе сьцерагчы спрыяльны момант для выпраўленьня лініі.

З чаго-ж канцэпцыя вонкавае палітыкі павінна выходзіць? Што мае вызначаць ейны кірунак?

На нашую думку, яна, бяручы на ўвагу свае меты и выходныя прынцыпы, мусіць выходзіць із геапалітычнага палажэньня краю, ягоных прыродна-эканамічных багацьцяў ды колькасьці насельніцтва, і ўсё гэта ў суадносінах да ўсяго гэтага, эканамічнага й подзьвога патэнцыялу партнэраў. Пры гэтым канцэпцыя павінна апірацца на гістарычную традыцыю вонкавае палітыкі папярэдніх пакаленьняў, каб браць на ўвагу навуку гісторыі.

З гледзішча вымогаў часу ведамыя сяньня канцэпцыі вонкавае палітыкі можна было-б разьбіць на два кірункі: а) на старыя канцэпцыі — **собска-нацыянальныя**, паводля якіх кажны народ ці дзяржава ўкладае свае вонкавыя дачыненьні беспасярэдня зь іншымі народамі ці дзяржавамі й б) новыя — **міжнародна-рэгіянальныя**, паводля якіх міжнароднае супрацоўніцтва ў сусьветным маштабе мае дачыненьне із рэгіянальнымі блёкамі народаў-дзяржаваў, так ці іначай сьвязаных міжсобку з мэтаю лепшае абароны сваіх інтарэсаў. Старыя канцэпцыі ў наш новы час ужо ня здольныя гарантаваць утрыманьня ўсеагульнага міру й справядлівасьці, а паасобным народам — свабоды й незалежнасьці. Гэта асабліва выразна нацьверджана фактамі, пачынаючы ад 1-ае сусьветнае вайны. Анэксія Расейскай Імпэрыяй цалае ўсходняе Эўропы — найяскравейшы гэтаму прыклад. Таму тварэньне Лігі Нацыяў і Арганізацыі Злучаных Народаў ў сусьветным маштабе, паўстаньне рэгіянальных блёкаў па форме саюзу амэрыканскіх дзяржаваў, Лігі Арабскіх народаў, Заходня-эўрапэйскае кунія і г. д. ёсьць вымушаным шуканьнем новых спосабаў і сродкаў унармаваньня міжнародных дачыненьняў.

Вось-жа, мы, выснаючы канечную патрэбу шырокага міжнароднага супрацоўніцтва ў сусьветным маштабе, мусім сваю вонкава-палітычную канцэпцыю строіць на аснове міжнародна-рэгіянальнага абсягу. Але гэта яшчэ болей забавязвае нас сэрога трыманца прынцыпу раўнапраўнасьці й затрыманьня за сваім народам дзяржаўнае й нацыянальнае суверэннасьці. Наша канцэпцыя павінна базавацца на цесным супрацоўніцтва зблёкаваных міжсобку самастойных дзяржаваў, а не на іхным зьліцьці ў супольны дзяржаўны арганізм. Яна павінна выключаць таксама ўваход Беларусі ў такі рэгіянальны блёк, у якім магла-б быць супрэмацыя якога-колечы народу, а тым болей таго, над панаваньнем якога ў мінулым была Беларусь.

Аднак і міжнародна-рэгіянальныя канцэпцыі ў сваю чаргу могуць быць двух родаў: а) **імпэрыялістычна-агрэсыўныя**, якія шляхам гвалту й паняволеньня іншых народаў творацца імпэрыялістычнымі дзяржавамі з мэтаю ліквідацыі ці іншых канцэнтральных дзяржаваў ды поўнага падпарадкаваньня іх свайму падзяржаўнаму арганізму й б) **абаронныя** канцэпцыі, паводля якіх шляхам дабрахвотнага задзіночаньня блякуюцца вольныя народы ці дзяржавы з мэтаю лепшае абароны сваіх дзяржаўна-нацыянальных інтарэсаў ад імпэрыялістычных дзяржаваў.

Нашая міжнародна-рэгіянальная канцэпцыя мусіць быць канцэпцыяй абаронпай.

Але перш, чым гаварыць аб ей, разгледзім сьпярша тыя міжнародна-рэгіянальныя канцэпцыі, якія ў апошнім часе міжнароднага супрацоўніцтва пачалі прыцягваць да сябе ўвагу палітычнае думкі сьвету. Пры гэтым мы маем на ўвазе тыя канцэпцыі, каторыя ахопліваюць прастор, на якім жыве беларускі народ і ў якіх Беларусь магла-б быць болей ці менеі незалежнай дзяржавай.

1) Канцэпцыя **Задзіночаных Дзяржаваў Эўропы.** Па-

Вялікае міжнароднае палітычнае вечa у Рэгенсбургу

З прычыны трэціх угодкаў закладзінаў Арганізацыі Задзіночаных Народаў у нядзелю 24 кастрычніка у Рэгенсбургу ў Нойгаўсэль адбыўся вечa.. Вялізарная заля была перапоўнена народам. Прыйшло каля паўтары тысячы людзей з паміж высяленцаў розных народаў і Нямцаў. У прэзыдыюме вечa былі па два прадстаўнікі ад кажнае нацыянальнае групы высяленцаў, наймя: ад Беларусаў, Латышоў, Ліцьвіноў, Палякоў, Расейцаў, Славакоў і Украінцаў. На вечу разглядалася пытаньне дзейнасьцці УН і дачыненьняў паміж Захадам й Усходам. Учасьнікі вечa задавалі пытаньні, скіраваныя да тае ці іншае нацыянальнае групы, на каторыя адказавалі прадстаўнікі тае групы з Прэзыдыюму. Першым пытаньнем, з каторым звярнуліся да беларускай нацыянальнай групы было: «Чаму Масква так страшна нішча народ беларускі?», на якое беларускі прадстаўнік даў гэткі адказ: Сваім паходжаньнем (балта-славянскім), сваёй псыхікаю, культураю, цэлым гістарычным развоям Беларусы чыстыя Эўрапэйцы, і яны грапічаць на ўсходзе з прасторай маскоўскай, па сваёй прыродзе варожай Эўропе, атрымаўшай ў спадчыне ад Турка-Татар імпэрыялістычныя імкненьні,

Гэта было галоўнай прычынаю, чаму гісторыя беларускага гаспадарства, ведамага пад назовам Вялікага Княства Літоўскага, адзначаецца блізу бязупыннымі войнамі з гаспадарствам маскоўскім. А пасьля зьнішчаньня Масквою беларускага гаспадарства ў канцы XVIII ст. Беларусы ў XIX ст. робяць супроць Масквы — Расеі тры вялікія паўстаньні (1812 г., 1831 г. і 1863 г.). А калі ў Расеі царскі абсалютызм быў заменены ў канцы 1917 г. таталізмам чырвоных дыктатараў, дык камуністычная дыктатура стрэла ў Беларусі яшчэ большае супраціўленьне, умімся ўцевад дэспотыя царскай. Гэтае спраціўленьне вынікала, як із нацыянальнай і маральнай адпорнасьці беларускага народу, так із характару ягонага, што адзначаецца ідэялізмам і індывідуалізмам, нязнаючым маскоўскае «общины» (калектыўнага дзяржаньня зямлі), гэтага першатыпу цяперашніх калхозаў, вынікала яна з цэлага ўкладу жыцьця беларускага народу.

Беларусы ў канцы 1917 аднавілі сваё незалежнае гаспадарства ў форме Беларускае Народнае Рэспублікі Гэтае гаспадарства ў 1921 г. было зьліквідавана чырвонаю Масквою, а заміж яго Масква, дзеля ашуканьня беларускіх народных масаў і загранiцы, стварыла сваю фікцыю — Беларускую Сав. Сац. Рэспубліку. На гэта беларускі народ адказаў паўстаньнямі, а партызанскае ходаньне беларусаў з маскоўскімі акупантамі ніколі ня спынялася; асабліва вядзецца гэта ходаньне цяперака, дарма што гітлераўская Нямеччына зь яе фізычным нішчэньнем людзей акупаваных краёў дзеля стварэньня сабе лебэнсраўму вельмі памагла Маскве дзяржаць у няволі чужыя народы.

Зь менаваных прычынаў камуністычная партыя Беларусі ёсьць няпрапарцыянальна нячысьленай, і большыню ўсёй складаюць не камуністыя Беларусы, а насланыя Масквою. Дый ня толькі беларускія народныя масы й інтэлігенцыя нішчана Масквою, але й Беларусаў камуністых масава растрэлююць і ссылаюць у канцэнтрацыйныя табары ды нат усе дагэтуленнія прэзыдэнты Беларусы (Бел. Сав. Сац. Рэспубліка, з гледзішча палітычнага фікцыйнае гаспадарства і прэзыдэнты вызначанныя тэй-жа Масквою), не памерлі прыроднай сьмерцю, а былі замучаны маскоўскімі, камуністымі. Дзе ясна, чаму камуністычная Масква, зьдзекуючыся над шмат якімі народамі, у тым ліку над сваім маскоўскім, асабліва перасьледуе й нішча народ беларускі.

Другое пытаньне, зьверненае да беларусаў, гучэла: «Ці ўрад Беларускае Сав. Сац. Рэспублікі прадстаўляе беларускі народ, а калі не, дык хто яго прадстаўляе?». Адказ быў гэткі: Беларусь зьяўляецца незалежным гаспадарствам з гледзішча праўнага, бо нат належа да Арганізацыі Задзіночаных Народаў, але ня ёсьць незалежным гаспадарствам з гледзішча палітычнага. Улада БССР ёсьць агентураю маскоўскага акупанта. Масква зацьвярджае Найвышэйшую Раду БССР а над кажным міністрам БССР стаіць адпаведны саюзны міністар ў Маскве і гэты кіруе. Кажнага міністра БССР улучна з прэзыдэнтам можа кажную часіну НКВД арыштаваць і забіць, што ўжо было шмат разоў.

Сваю фікцыю БССР Масква стварыла пасьля звалваньня бо Беларускае Народнае Рэспублікі, паўсталае у 1917 — 1918 г.г. волі яго ўсяго беларускага народу. Рада Беларускае Народнае Рэспублікі была выбрана дэмакратычным спосабам усім беларускім народам, і спаўняючы орган гэтае Рады, Урад БНР, цяпер на эміграцыі на чале з Прэзыдэнтам М. Абрамчыкам, ёсьць паўнапраўным прадстаўніком беларускага народу. Згодна з пастановаю Рады БНР свае паўнамоцтвы Урад БНР заховае датуль пакуль беларускі народ у сваёй звольненай ад акупанта Бацькаўшчыне ня створа свабоднымі дэмакратычнымі выбарамі сабе новага прадстаўніцтва.

Якаісь маскоўка не ўнадабала першы адказ беларускага прадстаўніка, і яна зарэагавала гэткім закідам: «УНО — ставаецца задзіночыць усе нацыі, а Вы, ставянін на нарэджаньню, прамаўляеце зараз супраць свайго найбліжэйшага брата — расейца. Нашто гэта?».

Беларускі прадстаўнік адказаў гэтак: «Як я ўож зацеміў у сваім адказе на першае пытаньне, мы Беларусы ўважаем за сваіх братоў і Славян і Балтаў і ўсе іншыя народы, у тым ліку і народ маскоўскі. Але, уважаючы гэтак, ня хочам быць у турме свайго маскоўскага брата. І калі вы Расейцы ўважасце нас за сваіх братоў, дык не жадайце нам свае турмы. Пакіньце нас. Не перашкаджайце нам быць незалежнымі, якімі мы былі калісь. Ня крыўда задзіночые народы, але справядлівасьць. У дачыненьню да нас Беларусаў у васноўным аднолькавыя Расея царская й камуністычная. Розьніца толькі ў ступені. У Расеі царскай мы ня мелі свабоды нацыянальнай, палітычнай, гаспадарскай, а ў савецкай апрача таго ня маем і сямейнай. А калі вы інакшыя ад бальшавікоў і Расейцаў царскіх, дык пакажэце гэта. Не жадайце няволі й зьдзеку над іншымі народамі.

Пасьля адказаў на ўсе пытаньні была і аднагалосна прынята наступная рэзалюцыя:

РЭЗАЛЮЦЫЯ

Дня 24.10.48 сабраліся ў Рэгенсбургу, Нойгаўсэль, эмігрыцыйныя прадстаўнікі латыскага летувіскага, польскага, расейскага, славацкага, украінскага, чэскага і беларускага народаў, каб ушанаваць 3-гадовае існаваньне Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў.

Мы вітаем Намаганьні Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў, якія накіроўваны згодна духу Атлянтычнай хартыі на ўтрыманьне і замацаваньне міру і выключэньне збройных канфліктаў.

Мы мусім аднак з вялікім несупакоем сьцьвердзіць, што Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў да гэтага часу ня здолела знайсьці дастатковых мераў у справе вырашэньня так жыцьцёва важных праблемаў. Спасьрод найбольш важных пытаньняў, якія нясупакояць цэлы сьвет і якія павінны быць ужо канчаткова і бескампрамісова вырашаны, ёсьць:

1. Вызваленьне бяспраўна анэктаваных краінаў.

2. Скасаваньне тых сучасных урадаў, якія супраць волі большыні былі сілай накінутымі і якія апіраюцца толькі на нязначнай мяншыні а таксама і анулюваньне сілай уведзеных сацыяльных нарадкаў (як калгасная гаспадарка, пролетарызацыя і т. п.).

3. Не дапушчаць да рэлігійных прасьледваньняў і ізноў увесьці вольнасьць думак, вольнасьць прэсы, вольнасьць зборaў і вольнасьць рэлігійных пераконаньняў.

4. Скасаваньне прымусовых зсылак і нявольнічай працы, ліквідацыя ўсіх канц. лягероў, вызваленьне ад паліцыйнага тэрору і страху.

5. Увядзеньне роўнасьці паміж усімі народамі сьвету.

6. Скасаваньне формаў урадаў, якія былі сілай накіданы і ўвядзеньне такіх формаў жыцьця, якіх сабе жадаюць гэтыя народы.

Згодна дэмакратычным прынцыпам і ўзьнёслым намаганьням чалавецтва мы верым, што Арт. Аб'яд. Нац. знойдзе такія сродкі, якія дазволяць ёй вызваліць чалавецтва ад страху і гвалту, вызваліць падняволеныя народы і ўтрымаць сталы супакой на сьвеце.

ДП У КАНАДЗЕ

Ад заканчэньня вайны было з амэрыканскай зоны Нямеччыны пераселена ў іншыя краіны 127.022 ДП. Зь іх прыблізна 10% узяла Канада, 3.900 з гэтае колькасьці былі блізкімі сваякамі канадзкіх грамадзянаў, 2.125 выехала на лясныя работы, 2.095 на дамашнія работы, 950 працуе ў капальнях, 488 — у вадзяных прадпрыемствах, 606 на сельскай гаспадарцы, 1.141 — у тэкстыльнай прамысловасьці, 673 — пры будове дарог, 75 — на алюміньявых прадпрыемствах, у цяжкай прамысловасьці — 120 чалавек. У іншых спэцыяльных прафэсіях працуе яшчэ 215 чалавек. Апрача гэтага кангрэс канадзкіх жыдоў прыняў 343 жыдоўскіх сірот.

Сваякі канадзкіх грамадзянаў у колькасьці 81 асобы ўжо афармленыя да выезду, а 1.223 асобы яшчэ чакаюць на вызыў у Канаду.

(«Інфармацыя ІРО» № 52)

Грамадзкім абавязкам кажнага сьведамага беларуса ёсьць прыбаньне найменш аднаго падпішчыка газэты «Бацькаўшчына». Не павінна быць ніводнага беларуса на чужыне, які-б не атрымліваў «Бацькаўшчыны»!

водля гэтае канцэпцыі, Эўропа мела-б задзіночыцца ў фэдэрацыю вольных дзяржаваў із супольнымі агульнаэўрапэйскімі наднарлямэнтам і надурадам. Стварэньне такога наддзяржаўнага эўрапэйскага арганізму вымагала-б дабраахвотнага адрачэньня кажнай вольнай эўрапэйскай дзяржавай ад часткі сваіх суверэнных правоў.

Гэтая канцэпцыя, хоць і падкрэсьлівае, што ў ЗДЭ мелі-б увайсьці на роўных правох усе эўрапэйскія дзяржавы, але не дае сёньня дакладнага праліку, ухіляючыся ад спрэцызаваньня свайго пагляду на праблему Усходняе Эўропы. Ужо адно гэта ня можа ня выклікаць у нас паважных засьцярогаў да канцэпцыі, бо якраз нашая нацыянальная праблема й ляжыць у сферы разьвязаньня праблемы гэтае часткі эўрапэйскага кантынэнту.

Калі аднак дапусьціць, што ў склад ЗДЭ магліб увайсьці, як раўнапраўныя дзяржавы, Беларусь, Украіна, этнаграфічная Расея. Грузія й г. д., то й пры гэтым канцэпцыя ЗДЭ на бліжэйшы час ня можа быць канцэпцыяй нашае вонкавае палітыкі, бо на сваім шляху яна мае столькі складаных праблемаў нацыянальна-палітычнага, эканамічнага й культурнага характару, што на сяньня, яна можа быць толькі ідэяй болей-меней далёкае будучыні. Галоўнаю спаміж гэтых праблемаў ёсьць падзел Эўропы на два зусім розныя між сабою сьветы — сьвет дэмакратычнага захаду й сьвет таталітарнага ўсходу. Пры такім стане рэчаў адсутнічае атмасфэра ўзаемнага даверу між народамі й разуменьне супольных эўрапэйскіх інтарэсаў. Разьвязаньне гэтае праблемы магло-б наступіць толькі ў выпадку ўстанаўленьня поўнае й запраўднае свабоды й раўнапраўнасьці ўсіх эўрапэйскіх народаў, а гэта ў сваю чаргу магчыма толькі пры карэнным разьвязаньні праблемы расейскага імпэрыялізму шляхам разьдзелу Расейскае Імпэрыі на ейныя складовыя нацыянальныя часткі.

Калі-б усё-ж супольныя інтарэсы народаў Эўропы й вымагалі хутчэйшага фармальнага праклямаваньня ЗДЭ, то ў іхных рамах нямінуча мусілі-б на даўжэйшы час затрымацца меншая рэгіянальныя блёкі, бо паасобныя часткі Эўропы знаходзяцца сяньня ў такіх адменных умовах, што лёкальныя інтарэсы розных групаў дзяржаваў могуць яшчэ доўга пераважаць над інтарэсамі агульнаэўрапэйскімі.

Таму для беларускае вонкавае палітыкі, а нам выдаецца, што й для палітыкі іншых народаў усходняе, цэнтральнае й паўдзённае Эўропы, ідэя ЗДЭ ня ёсьць сёньня насьпелай і актуальнай, хоць абавязкам нашым ёсьць пільна сачыць за ейным далейшым разьвіцьцём, каб у будучыні, калі-б гэтая канцэпцыя сталася рэальным фактам, Беларусь магла заняць ў ёй роўнае месца сярод іншых дзяржаваў Эўропы.

2) Канцэпцыя **Міжмор'я.** Паводля гэтае канцэпцыі з мэтаю зраўнаважаньня сілаў нямецкага й расейскага імпэрыялізму мела-б паўстаць вунія дзяржаваў, што ляжаць між Нямеччынай і Расеяй ад Міжземнага да Балтыцкага мора. У гэтую вунію ўвайшлі-б такія дзяржавы: Албанія, Сэрбія, Харваччына, Славэнія, Грэцыя, Баўгарыя, Вугоршчына, Румынія, Чэхія, Славаччына, Польшча, Эстонія, Латвія, Летува, Беларусь і Украіна.

Хоць пад паглядам практычным гэтая канцэпцыя й мае пад сабою рэальны грунт, аднак яна ня можа нас поўнасьцю здаволіць, бо не гарантуе нам утрыманьня нами дзяржаўнае незалежнасьці ў кажнай міжнародна-палітычнай сытуацыі. Сіла міжмор'еўскае вуніі скіраваная галоўна супраць нямецкага імпэрыялізму, у чым найбольш зацікаўленыя дзяржавы, што межуюць зь Нямеччынай, а Беларусь, Украіна й Прыбалтыка, дзякуючы свайму геапалітычнаму палажэньню, мелі-б у ёй зусім няпэўныя пазыцыі, якія-б практычна маглі зьвесьціся да ролі бар'еру вуніі ад расейскага імпэрыялізму. Гэта тым балей, што канцэпцыя Міжмор'я ня ставіць перад сабою мэты поўнага разьвязаньня праблемы расейскага імпэрыялізму.

Беларусь мае й будзе мець шмат супольных інтарэсаў зь дзяржавамі, якія мелі-б увайсьці ў Міжмор'е. Сяньня нас лучыць зь імі лёс супольнага змаганьня за адваяваньне свае свабоды й незалежнасьці, а заўтра будзе лучыць супольны інтарэс абароны гэтае свабоды й незалежнасьці перад супольным ворагам. Але ці ў кажнай міжнародна-палітычнай сытуацыі гэтыя дзяржавы будуць уважаць свае інтарэсы за аднолькавыя з нашымі? У чым зарука таго, што згодзяцца ўзяць на сябе цяжар беларуска-расейскіх, украінска-расейскіх і прыбалта-расейскіх узаемадачыненьняў і датрымаюць свае забавязаньні перад намі да канца? Ці ня можа стацца так, што ў цяжкім ходаньні за ўтрыманьне свае незалежнасьці яны могуць ахвяраваць расейскаму імпэрыялізму Беларусь, Украіну й Прыбалтыку?

Калі-б аднак і гэта выключыць і верыць, што народы Міжмор'я разумеюць карысьць для сябе вызваленьня Беларусі, Украіны й Прыбалтыкі, хоць-бы дзеля таго, што гэтым яны ў значнай ступені аслабілі-б расейскі імпэрыялізм і тэрытарыяльна адгарадзіліся-б ад яго нашымі землямі, то ці хопіць сілаў Міжмор'я для зраўнаважаньня сілаў Нямеччыны й Расеі, каб у каж, най сытуацыі магчы процістаяць іхнай агрэсіі? Мы думаем, што ня хопіць. Нам ня варта пры гэтым забывацца, што Расея пры існаваньні Міжмор'я тым балей прыкілілася-б да вонкава-палітычнай канцэпцыі Бісмарка й магла-б супольна зь Нямеччынай паціскаць на міжмор'еўскую вунію. Ці ня мэтазгодным быго-б з гэтых прычынаў рассунуць межы Міжмор'я, каб прыняць у ягоную сям'ю й іншыя нерасейскія народы расейскае імпэрыі, якіх лучыць з намі супольны лёс няволі й змаганьня супроць аднаго й таго-ж панявольніка? Тады-б праблема расейскага імпэрыялізму разьвязалася-б сама сабою.

Таму й гэтая канцэпцыя ня вычэрпвае ўсіх вымогаў нашае вонкавае палітыкі.

3) Канцэпцыя **«Саюзу вольных народаў Расеі».** Упершыню гэтая канцэпцыя паўстала ў 1918 г., як сродак здушэньня нацыянальных рэвалюцыяў былое Расейскае імпэрыі, якія ў сваім змаганьні за свабоду з-пад расейскае няволі, узьняліся да праклямаваньня незалежнасьці сваіх нацыянальных дзяржаваў. Аўтарамі яе былі бальшавікі. У што выліўся гэты «Саюз вольных народаў Расеі» — СССР наш народ хіба добра ведае. За часоў-жа 2-ое сусьветнае вайны гэтую самую ідэю, але ў ейным новым выданьні пачаў прапагаваць правадыр новых расейскіх імпэрыялістых ген. Уласаў. У самым апошнім часе да яе прыступіў і лідэр расейскіх сацыялістых у ЗША Керанскі.

Дзеля таго, што гэтая канцэпцыя належыць да імпэрыялістычна-агрэсыўных і ставіць сабе за мэту затрымаць ды надалей здушваць нацыянальна-вызвольныя рухі народаў, паняволеных Расеяй, мэту далейшага ўтрыманьня ўзурпацыі расейскім народам сувэрэнных правоў нерасейскіх народаў у ймя захаваньня ўсё тойжа адзінае й непадзельнае Расейскае імпэрыі ў ейных найшырэйшых межах, — наша становішча да яе можа быць толькі негатыўным.

Такім чынам, ніводная зь існуючых новых вонкава-палітычных канцэпцыяў не адпавядае ўсім вымогам беларускае вонкавае палітыкі.

(Працяг будзе).

Зь Беларускага Жыцьця

КАНЦЭРТ САМАДЗЕЙНАСЬЦІ НА НОВЫМ МЕСЦЫ

Беларуская Гімназія імя Янкі Купалы з цэлым педагагічным складам і абсалютнай большынёю гімназістых у зьвязку із рэарганізацыяй лягераў Міхельсдорф і Вінтэршыбергердорф, 6-та кастрычніка сёлета пераехала ў лягер Вінтэршыбергердорф. Атрымаўшы ў новым лягеры асобны будынак над класы й бурсу, Гімназія адразу-ж пачала нармальныя заняткі, распачатыя яшчэ ў лягеры Міхельсдорф.

У сыботу 23-га кастрычніка гімназістыя, разам із вучнямі беларускае пачатковае школы, зладзілі для жыхароў лягеру свой першы канцэрт мастацкае самадзейнасьці на новым месцы. Лягерная саля была перапоўненая гледачамі. Праграма канцэрту, уложаная пераважна з гумару й беларускае музыкі, была сустрэтая зь вялікім адабрэньнем прысутных. Найбольшае ўражаньне выклікала і камічная сцэна зь беларускае апэрэты «У гаі раі» (абрэта Н. Арсеньневай, музыка камп. М. Куліковіча), беларускія народныя песьні ў выкананьні актэту гімназістак, камічная імправізацыя зь лягернага жыцьця, інсцэнізацыя казкі «Рэпка» і гумарыстычнае апавяданьне Ядвігіна Ш. «Важныя фігі». Удалы канфэранс з дасьціпным гумарам прыемна дапоўніў прыгожы канцэрт.

Жыхары лягеру пачалі адчуваць, што ў іхным жыцьці павеяла сьвежай струёй беларускае культурнае працы.

НА БАЦЬКАЎШЧЫНЕ ЯНЫ НЕПАТРЭБНЫЯ

Новы восьмы нумар «Беларускага Эмігранта», што выходзіць у Канадзе, прыносіць вельмі цікавы артыкул пад загалоўкам «Чаму ім не дазваляюць?». У ім гаворыцца аб тым, што многія канадзкія беларусы, якія знаходзяцца ў Канадзе ад даўжэйшага часу й падпалі пад уплыў савецкае прапаганды, запісаліся ў савецкіх канзулятах на выезд на бацькаўшчыну. Яны, наіўна паверыўшы гэтай ілжывай прапагандзе, якая не перастае там дзеіць і сяньня, думаюць, што СССР - - гэта запраўдны рай для працоўных, якога ня можна й параўняць із «капіталістычным вызыскам» і «цяжкім палажэньнем» работнікаў ў Канадзе. Дык наіўныя людзі й пастанаўляюць, як мага, хутчэй у гэты «рай» вярнуцца.

Але тут здараецца несамавітая рэч. Калі прадстаўнікі Савецкага Саюзу ў Эўропе ўжываюць усякіх магчымых і немагчымых спосабаў, каб прымусіць вярнуцца назад у Савецкі Саюз усіх новых эмігрантаў і перамешчаных асобаў, што пабывалі ўжо ў гэтым «раі» і ні за якую цану быць у ім болей не жадаюць, то спасярод канадзкіх беларусаў, што запісаліся на гэты выезд, як і спасярод іншых падсавецкіх нацыянальнасьцяў, даслоўна ня выехаў яшчэ ніводзін чалавек. Савецкія канзуляты не даюць дазволаў на ўезд у Савецкі Саюз. Прадстаўнікі гэтых канзулятаў выясьняюць гэтым людзям, што Савецкі Саюз зьяўляецца моцна зьнішчаны вайною, а Сталін моцна клапоціцца аб лёсе эмігрантаў, якім цяпер, вярнуўшыся на бацькаўшчыну, нейкі час было-б жыць цяжэй, чымсьці на эміграцыі. Затое, як Савецкі Саюз адбудуецца й наагул залечыць свае раны, нанесеныя вайною, тады ахвотна дазволіць туды вярнуцца ўсім жадаючым.

Вось-жа «Беларускі Эмігрант» правільна выясьняе такім наіўным беларусам, што ня клопаты пра чалавека, але зусім іншыя прычыны змушаюць Саветаў да адмовы на права павароту на Беларусь. Гэта наступныя дзьве прычыны: 1. Бальшавікі добра ведаюць, што калі заагітаваныя імі прыхільнікі камунізму вернуцца й пабачаць камуністычную сыстему на практыцы, то стануцца найвялікшымі яе ворагамі й павядуць непажаданую агітацыю сярод савецкага насельніцтв, якое, як ведама, трымаецца ў строгай ізаляцыі і няведаньні аб запраўдным палажэньні ў заходнім сьвеце. 2. Гэтыя людзі якраз патрэбныя Саветам заграніцай, каб вялі там разбуральную бальшавіцкую работу.

НОВЫ ФРАНЦУСКІ ІМІГРАЦЬЙНЫ ПЛЯН

26 кастрычніка 1948 г. адбылася ў Нойербюрзе (французская зона) Канфэрэнцыя ІРО ў справе перасяленьня ДП у Францыю. З боку французкіх уладаў на Канфэрэнцыі былі прысутныя: сп. Лёвэрнуа, галоўны кіраўнік Аддзелу Перасяленьня ў Францыю; сп. Росс, кіраўнік Аддзелу Перасяленьня на Нямеччыну; сп. Вэбэль, кіраўнік Аддзелу Перасяленьня ў Парыжы і некалькі мясцовых працаўнікоў ІРО. З боку ДП былі прадстаўнікі шматлікіх Цэнтральных Камітэтаў у Нямеччыне, у тым ліку й прадстаўнікі Беларускага Нацыянальнага Камітэту. Усе яны былі запрошаныя Галоўнаю Кватэраю ІРО.

Канфэрэнцыю адчыніў сп. Лёвэрнуа. Ён цёпла прывітаў усіх прысутных і заявіў, што мэтай канфэрэнцыі зьяўляецца прадыскутаваньне новага французскага імігрыйнага пляну. Пры гэтым ён зазначыў, што канфэрэнцыя адпачасна павінна выясьніць прычыны таго, чаму дасюль адносна невялікая частка ДП перасялілася ў Францыю і адпаведна скарыкаваць іх. З свайго боку сп. Лёвэрнуа падчыркнуў некаторыя памылкі дасюлешней практыкі перасяленьня: варунак, што на працягу 90 дзён павінны былі пераехаць у Францыю таксама сем'і перамяшчэнцаў, не заўсёды быў споўнены; працоўныя кантракты не заўсёды адпавядалі жаданьням выехаўшых, а таксама сам спосаб выбару людзей ня быў заўсёды адлаведны. Новы плян адкідае ўсе гэныя недамаганьні. Паводля яго, усе жадаючыя выехаць на сельска-гаспадарскія працы ў Францыю, забіраюць адразу з сабою свае сем'і. У сям'і могуць быць працаўнікі да 55 годаў, а павет і старэйшыя, а таксама й малыя дзеці. Пераехаўшыя ў Францыю разьмяшчаюцца ў лягерах і будуць пад апекай ІРО. Тут яны знаёмяцца зь месцам свае працы і толькі пасьля гэтага падпісваюць працоўныя кантракты. Сам спосаб набору будзе значна прасьцейшы.

Сп. Росс заявіў, што французы ня хочуць рабіць сабе ніякае прапаганды, абвяшчаючы новы сельскагаспадарскі імігрыйны плян.. Яны прапануюць толькі для перамяшчэнцаў рэальныя магчымасьці працы й жыцьця. Каб не паўтараць старых памылак і не рабіць новых, прамоўца таксама заклікаў усіх прысутных ясна й адкрыта выказаць свае думкі адносна мінулага й новага пляну перасяленьня.

Пасьля гэтага была праведзена шырокая, свабодная дыскусыя й крытыка адносна варункаў працы й жыцьця ў Францыі, дасюлешніх спосабаў вырбовачных камісіяў, а таксама былі выказаны розныя пажаданьні ў сувязі з новым плянам, які ў аснаўным спаткаўся з прыхільнай ацэнкай. Было таксама парушана пытаньне інтэлігенцыі; магчымасьцяў пасланьня ў Францыю нацыянальных дэлэгацыяў, якія-б пазнаёміліся з варункамі працы на месцы і магчымасьцяў арэнды вольных гаспадарак.

Сп. Лёвэрнуа й сп. Росс далі вычэрпваючыя адказы на ўсе парушаныя пытаньні. Справа штрайкаў у прамысловасьці ніколі не закранала й не закранае сельскага гаспадарства. Такія здарэньні адбываліся ў Францыі й раней. Яны ніколы не парушылі нутранае раўнавагі, ладу й парадку дзяржаўнага жыцьця. Рэальны даход сельска-гаспадарскага работніка ў Францыі большы, чым работніка прамысловасьці. Ён зарабляе 8 — 10.000 франкаў у месяц, акрамя таго дастае ежу й памешканьне. Францыя заўсёды славілася сваім добрым харчаваньнем, асабліва на вёсцы. У Францыі працуе звыш двох мільёнаў чужынцаў, сярод каторых ёсьць беларусы, украінцы, палякі, расейцы і г. д. Дзеля гэтага кажны перамяшчэнец заўсёды лёгка знойдзе сваіх землякоў і ня будзе пачуваць сябе асабліва апушчаным. Французы вельмі добра адносяцца да чужынцаў. Што датычыць вольных гаспадарак і інтэлігенцыі, зазначыў сп. Лёвэрнуа, дык, хаця гэтае пытаньне й не ўваходзіць у новы плян, аднак ён будзе стараца парушыць яго ў Парыжы. Ён таксама ўважае, што пытаньне высылкі дэлэгацыяў у Францыю будзе разьвязана пазытыўна.

Сп. Вэбэль выказаў надзею, што прадстаўнікі Нацыянальных Камітэтаў правільна зразумелі ідэю новага пляну й таму спрычыняцца да яе ажыцьцяўленьня. Сяньняшняе перасяленьне ДП у Францыю не зьяўляецца для нас нічым новым. Тысячы беларусаў, палякаў, украінцаў, расейцаў і г. д. даўно ўжо працуюць у Францыі. Каля 60.000 іх прыбыла сюда ўжо ў апошні час. Усе яны працуюць і жывуць ня дрэнна. Вязумоўна, ня ўсе аднолькава, але ня жывуць аднолькава й усе Французы, гэта справа індывідуальнае ініцыятывы. Галоўная рэч, што ў Францыі праца аплачваецца аднолькава як для французаў так і для чужынцаў. Новы сельска-гаспадарскі плян так ці іначай будзе зрэалізаваны.

На заканчэньне сп. Лёвэрнуа, між іншым, зазначыў, што канфэрэнцыя была вельмі пасьпяховай. Яго цешыла, што ўсе прысутныя зразумелі дух новага пляну, паводля якога будзе праводзіцца перасяленьне. Жывая, канкрэтная крытыка напэўна спрычыніцца да некаторых зьменаў на карысьць пляну й перамяшчэнцаў. Далей ён падчыркнуў, што ў чырвені 1950 г. апека ІРО канчаецца. Дзеля гэтага кажны павінен пасьпяшыць выкарыстаць дабрадзействы новага пляну, каб пасьля ня мусіў крытыкаваць сам сябе.

Дзякуючы яшчэ раз усім прысутным за выяўленьне зацікаўленьня ініцыятывай французскіх уладаў і за рэчовую крытыку, сп. Лёвэрнуа зачыніў канфэрэнцыю.

Прысутны.

ДА АРТЫКУЛУ «З ПАД ЗНАКУ ПАГОНІ» Н. ЗІШНЕЎСКАГА

У прадуманым і карысным менаваным артыкуле ёсьць адно месца, зь якім ня зусім можна згадзіцца, Наймя: у № (34) «Бацькаўшчыны» блізу на пачатку працягу гэтага артыкулу аўтар кажа, што ў нашых прашчураў **было амаль поўнае занядбаньне й недацэнка собскіх прыродных сілаў і высокага жыцьцёвага потэнцыялу народу** (падчыркненьне мае — Я. Ст.). Трэба згадзіцца, што ніколі ня будзе за шмат класьці націск на собскія сілы свайго народу і пэўне ў мінуласьці недаволі гэта рабілі, але ўсе-ж такі нельга сказаць, каб было такое вялікае занядбаньне прыродных сілаў собскага народу. Я зьвярну толькі ўвагу на адну пару ў гісторыі нашага народу, каб паказаць, што дыкжэ нашыя прадкі высака цанавалі сілы свайго народу, хоць, ведама, не заўсёды ў дастатнай меры: Гэта было 30 год пераможнага гэроізму крывіцкага (1558 — 1588 г.). У 1553 г. пачалася ў нашага гаспадарства даўгая вайна з Масквою, а далей супроць нас выступіла вайною Швэдыя й Данія, дамагаючыся тэрыторыі ўпалага Лівонскага ордэну, што прылучыўся быў да беларускага гаспадарства. Выступілі й хаўрусьнікі Масквы - крымскія Татары. Ідучы такім палажэньню, каб не заяваць яшчэ з Польшчаю, нельга было не пайсьці на вунію зь ёю, праз якую беларускае гаспадарства — Вялікае Княства Літоўскае - - прылучалася да Польшчы, хоць фактычна заставалася ўсё пастарому, з выняткам прылучанай да Польшчы Украіны і часьці этнаграфічна нашага Падляшша. І вось у такім палажэньню нашыя прашчуры на вайне собскімі сіламі перамаглі ўсіх сваіх праціўнікаў, канчальна прылучылі да свайго гаспадарства часьць прасторы Лівонскага ордэну, а Статутам 1588 г. адналілі незалежнасьць свае Бацькаўшчыны і з гледзішча праўнага. Праўныя асновы Люблінскае вуніі 1569 г. былі чыста зьменены. Заміж прылучэньня да Польшчы, аказалася конфэдэрацыя двух раўнапраўных гаспадарстваў — Беларусі й Польшчы. Мелі яны адгэнуль супольнага толькі гаспадара, бо нат супольны сойм быў такім адно намінальна; Крывічы мелі свой асобны вальны сойм у Слоніме пад назовам Галоўнага Сойміку, на якім прыймаліся пастановы ўсіх забавязуючыя, а на супольным сойме з Палякамі вяліся толькі перагаворы дзьвюх роўнапраўных сторанаў. Такой высокай ацэны сілаў свайго народу і іх выкарыстаньня рэдка можна знайсьці ў гісторыі іншых народаў.

У нашай гісторыі быў не адзін такі прыклад вялізнага выкарыстаньня собскіх сілаў свайго народу.

Я. Ст.

У АДКАЗ СПАДАРУ Я. СТ.

Вельмі паважаны Спадар!

Вашы характэрныя зьместам і формаю заувагі краналюць вельмі паважнае пытаньне, якое надаецца да шырэйшае дыскусіі. Баронячы свае тэзы, перадусім мушу адзначыць, што яна адносіцца да пазьнейшае фазы нашае гісторыі, скажам да 17 — 18 стагоддзяў, якія поўнасьцю пацьвярджаюць яе праўдзівасьць. Бо, калі на пачатку польскіх уплываў (пачатак 15 ст.) у нас было вольнае і поўнапраўнае сялянства, патрыятычнае баярства і сільнае сваім уплывам на кіраваньне гаспадарствам магнацтва, прычым усе яны, сяляне, баяры і магнаты, былі жыва зацікаўленыя у падтрыманьні гаспадарства і з дзеда-прадзеда існуючых у ім парадкаў— дык пасьля люблінскае вуніі 1569 г. абраз згрунту мяняецца: сялянства заганяецца безапэляцыйна у паншчыну, баярства, сьляпое і глухое на інтэрас усяго народу і гаспадарства, добіваецца становое «залатое вольнасьці» на польскі ўзор, і ўрэшце магнацтва траціць увесь свой уплыў і сілу. Цяпер ужо кажны з вытвараных станаў быў зацікаўлены або у радыкальнай зьмене ненармальных суадносінаў на той ці іншай дарозе (паасобныя спробы магнатаў, сялянскія бунты, казацтва), або у безгляднай абароне сваіх становых прывілеяў. І так, раней пачытыўна творчыя прыродныя сілы народу растраціліся у процістаўных сабе кірунках. Прытым справа тут не ў крышталізацыі станаў, якая бязумоўна раней ці пазьней мусіла прыйсьці, але ў тым, што крышталізацыя гэна адбылася не цягам натуральных сацыяльна-нутраных працэсаў, а дарогай штучнае, хоць і працяглае, інгэрэнцыі звонку. Дапушчэньне вось гэнае інгэрэнцыі нельга уважаць за пасьлядоўна гістарычную неабходнасьць — наадварот, яно роўназначнае вялікаму занядбаньню прыроднага патэнцыялу народу, які з тае пары відавочна пачынае занепадаць.

Прашу толькі мець на увазе, што мною тут адно сьцьверджаны гістарычны факт, без падрабязнага разгляду важных і вельмі складаных прычынаў ды гістарычных падзеяў, якія яго папярэдзілі. На гэта не дазваляла ані тэма, ані намеры мойго артыкулу.

Далей, я згодзен з Вамі, што у гісторыі нашай ёсьць багата гераічных і патрыятычных уздымаў народу. На вялікі жаль, яны тонуць яшчэ ў забыцьці і чакаюць на свайго «выназодніка». Але, калі ўважна прасачыць вякі 15, 16, 17 і 18-ты, ад Вітаўта пачынаючы, дык лёгка даецца спасьцерагчы выразнае дэкрэшчэндо, якое і завяршаецца упадкам гаспадарства у 1795 г. Між двума прыведзенымі тут зьявішчамі (сацыяльна-палітычных зьмен пад вонкавым уплывам і павольнага заняпаду) існуе бясспрэчная адпаведнасьць.

Цешыць таксама не згадзіцца з Вамі, што Вялікае Княства Літоўскае, як гаспадарства чыста беларускае, у канфэдэрацыі з Польшчаю захавала да самага свайго упадку усе атрыбуты і палітычна-праўдныя інстытуты асобнага гаспадарства, з дакладна азначанымі і сьцярожанымі межамі свае тэрыторыі.

П. Вішнеўскі.

ДОБРЫ ПРЫКЛАД

Задзіночаньне Беларускіх Вэтэранаў, Аддзел Рэгэнзбург, пастанавіла собскім коштам паставіць памятнік на магіле памерлага беларускага жаўнера Станіслава Манюка. Памятнік будзе пасьвечаны 2 лістапада на магільніку ў Рэгэнзбургу.

НАШЫЯ ПРАДСТАЎНІЦТВЫ ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ

1. У Вялікабрытаніі:
Association of Whiteruthenians in Gt. Britain 49, Linden Gardens, London, W. 2. England.
2. У Францыі:
Union des Travailleurs Biclorussiens en France 26 Rue de Montholon, Paris 9. France.
3. У Бэльгіі:
Mr. Kalinka Mikalaj, Rue de Bavendoel 4. Milmort-Liege. Belgique.
4. У Канадзе:
Mr. Pituska Jozeph, General Delivery. Ottawa. Ont. Canada.
5. У Аргентыне:
Asociacion Biclorusa en la Argentina, Calla Maza, 150. Buenos-Aires. Argentina.

Непасрэдна з гэтых Прадстаўніцтваў трэба ў далейшым выпісваць «Бацькаўшчыну» й там-жа ўрэгулёўваць належнасьць за яе.

Whiteruthenian Weekly „The Fatherland"
Authorized by EUCOM Hq. Civil Affairs Division 20 July 48, Nr. UNDP 225. Circulation 3500 copies.
Administration: (13b) Osterhofen, Ndby., Whiteruthenian, D.P.Camp.
Edited by: Whiteruthenian National Commitee.
Printed by: Georg Jakob, München 8, Pütrichstraße 3a.